ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 15 (1013) ● АЎТОРАК, 8 мая 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

# СА СВЯТАМ ПЕРАМОГІ!

*На адбыўшымся нядаўна агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе ўсебакова абмеркаван стан палітыка-выхаваўчай работы. Дакладчык — сакратар парткома Т. Я. Дударава — і выступіўшыя ў спрэчках камуністы прааналізавалі зробленае, прынцыпова крытыкавалі недахопы.*

## КЛОПАТ І АДКАЗНАСЦЬ КАМУНІСТАЎ

**З даклада сакратара партыйнага камітэта універсітэта Т. Я. ДУДАРАВАЙ**

У дакументах XXIV з'езда партыі, выступленні Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Брэжнева Л. І. на Усесаюзным злёце студэнтаў, выступленні тав. Машэрава П. М. на Рэспубліканскім студэнцкім злёце, у пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 18 ліпеня 1972 года «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» вызначаны далейшыя задачы вышэйшай школы, асобна падкрэслена, што савецкая вышэйшая школа павінна рыхтаваць маладых спецыялістаў, не толькі дасканала валодаючых сваёй спецыяльнасцю, маючых шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, але і ідэйна пераканаsuccessful, здольных быць актыўнымі праваднікамі палітыкі партыі, умеючых падыходзіць да з'яў грамадскага жыцця з класавых пазіцый. Партыйная арганізацыя універсітэта рашэнне гэтых задач лічыць галоўным напрамкам у сваёй рабоце.

Улічваючы тое, што сам працэс навучання ў савецкай ВНУ непарыўна звязан з камуністычным выхаваннем, намаганні рэктарата, парткома, партарганізацый і кафедр накіроўваюцца перш за ўсё на павышэнне ўзроўню выхаваўчага моманту ў працэсе навучання. Асаблівы клопат аб тым, каб лекцыі па ўсіх прадметах былі пранікнуты прынцыпам партыйнасці, каб яны садзейнічалі ўмацаванню ў студэнтаў камуністычнай перакананасці, выхоўвалі пачуцці савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, каб яны былі школай мыслення. Павышэнне ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню лекцый і семінарскіх заняткаў знаходзіцца ў прамой залежнасці ад росту кваліфікацыі і ідэйнага ўзроўню выкладчыкаў. Сапраўднымі педагогамі могуць быць толькі тыя, хто ўзброен марксісцка-ленінскай тэорыяй і метадалогіяй, глыбока разумее і праводзіць у жыццё палітыку нашай партыі, валодае шырокай эрудыцыяй. У нашым калектыве працуе вялікая армія педагогаў высокай кваліфікацыі — 1.140 чалавек, з іх 72 дактары, 472 кандыдаты навук. Толькі за апошні год вучоную ступень доктара атрымалі 8 чалавек, кандыдата навук — 33.

Ва універсітэце арганізавана стройная сістэма палітычнай вучобы прафесарска-выкладчыцкага саставу. Створаны і працуюць 34 тэарэтычныя, метадалагічныя і праблемныя семінары, у якіх навучаецца звыш тысячы чалавек. Кіруюць імі высокакваліфікаваныя прапагандысты тт. Сцяпанаў, Самускевіч, Ляўко, Навіцкі, Дулаў, Ткачоў, Янчанка, Петушкова і іншыя. У большасці семінараў заняткі праводзяцца на высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні, пры вялікай актыўнасці слухачоў, нярэдка на іх разгортваюцца ажыўленыя дыскусіі. Аднак у некаторых семінарах дапускаюцца зрывы і перанос заняткаў. Асобныя слухачы безадказна адносяцца да павышэння свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. Так, на факультэце прыкладной матэматыкі на занятках тэарэтычнага семінара, якім кіруе дацэнт Я. В. Петушкова, як правіла з 70 слухачоў прысутнічае 25—30. Асістэнт А. А. Куляшоў, напрыклад, у бягучым навучальным годзе не наведаў ні адных заняткаў. Старшыя выкладчыкі Н. А. Ладзіс, В. В. Гарачкін з сямі заняткаў прапусцілі пяць, асістэнт В. В. Бяляўскі — чатыры. І гэта тады, калі Я. В. Петушкова імкнецца кожныя заняткі праводзіць творча.

Цікава і змястоўна праводзіць заняткі з выкладчыкамі фізічнага факультэта дацэнт А. В. Самускевіч. Аднак і тут прапускаюць заняткі Б. І. Таўрогінскі, В. М. Астаф'еў, І. І. Бараўкоў, А. Ф. Юнусаў і іншыя. А падобных фактаў магло і не быць, калі б партбюро факультэтаў прыкладной матэматыкі і фізічнага больш займаліся работай семіна-

*(Працяг на 2-й стар.).*




## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

На днях грамадскасць беларускай сталіцы ўрачыста адзначыла 60-годдзе з дня нараджэння і 40-годдзе навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці дырэктара ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытута фізікі АН БССР, заслужанага дзеяча навукі, акадэміка, доктара фізіка-матэматычных навук, двойчы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Барыса Іванавіча Сцяпанава.

Адзін з заснавальнікаў беларускай школы фізікаў-спектраскапістаў, Барыс Іванавіч з 1958 г. і на працягу некалькіх год быў загадчыкам кафедры спектральнага аналізу фізічнага факультэта БДУ, чытаў асноўныя курсы, кіраваў дыпламантамі і аспірантамі.

Калектыў універсітэта рад павіншаваць Барыса Іванавіча Сцяпанава з юбілеем і прысваеннем яму высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Шчыра жадаем юбіляру многіх плённых год!





У першамайскіх калонах дэманстрантаў калектыў ардэнаноснага універсітэта імя У. І. Леніна.

Фота **М. Нечыпарэнкі**.

# КЛОПАТ І АДКАЗНАСЦЬ КАМУНІСТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

раў, трымалі іх дзейнасць пад кантролем, своечасова рэагавалі на гэтыя і падобныя факты. Нельга зняць адказнасць за ўпушчэнне ў рабоце тэарэтычных семінараў і з парткома універсітэта, які недастаткова глыбока ўнікаў у работу сістэмы партыйнай асветы і мала патрабаваў ад партбюро факультэтаў.

Праведзена вялікая работа па павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў. За тры гады вучобу прайшлі больш 500 выкладчыкаў. У другім семестры гэтага навучальнага года арганізаван універсітэт павышэння педагагічнага майстэрства маладых выкладчыкаў. Адбылося шэсць заняткаў, на якіх разглядаліся актуальныя пытанні работы са студэнцкай моладдзю. Аднак трэба прызнаць, што і тут з наведваннем заняткаў не ўсё добра. Са 110 маладых выкладчыкаў, якія павінны займацца, рэгулярна наведваюць лекцыі 70—80 чалавек. Дэканатам неабходна ўзмацніць кантроль і прад'явіць больш патрабавальнасці да нашых маладых выкладчыкаў за павышэнне іх педагагічнага майстэрства.

Рост педагагічнага майстэрства, ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладчыкаў садзейнічаў павышэнню навукова-тэарэтычнага і ідэйна-палітычнага ўзроўню выкладання ва універсітэце. З дапамогай вялікай групы партыйнага актыву нядаўна партком праверыў, як выкладчыкі кафедр удзельнічаюць у ідэйна-выхаваўчай рабоце. У ходзе праверкі было вывучана пытанне і аб тым, як кафедры адлюстроўваюць у навучальным працэсе рашэнні партыі і ўрада, як яны здзяйсняюць кантроль за ідэйным узроўнем лекцый і іншых відаў заняткаў. Вывучэнне паказала, што на большасці кафедр лекцыі чытаюцца і заняткі праводзяцца на належным узроўні. На радзе кафедр час вучэбных заняткаў шырока выкарыстоўваецца для выхавання ў студэнтаў камуністычнага светапогляду. На кафедры замежных моў філалагічнага факультэта, напрыклад, пры адборы тэкстаў загадзя плануюцца тэмы да знамянальных дат, рыхтуюцца канферэнцыі. Падобныя прыклады не адзінкавыя. Сёння можна назваць дзесяткі прозвішчаў выкладчыкаў, аб чыіх лекцыях студэнты гавораць з удзячнасцю. Сярод іх камуністы тт. Булацкі, Прытыцкая, Сцяпанаў, Лушчыцкі, Булахаў, Шкляр, Круцько, Ізох, Ткачоў, Капуцкі, Саржэўскі, Родзін, Фамічоў, Заўрыеў, Драбязка, Царук і шмат іншых.

Аднак мы сёння не можам яшчэ сказаць, што ў нас усе без выключэння лекцыі чытаюцца на высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні. На асобных кафедрах вельмі слаба пастаўлен кантроль за ідэйнай накіраванасцю лекцый. Праверка паказала, што ў планах раду кафедр гэтае пытанне нават не адлюстроўваецца, на пасяджэннях не абмяркоўваюцца лекцыі імення з пункту гледжання іх ідэйнай накіраванасці. Да гэтай пары сустракаюцца факты нядобрасумленных адносін некаторых выкладчыкаў да сваіх абавязкаў. У цяперашні час партком сумесна з рэктаратам вывучае пытанне «Аб падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў прафесарска-выкладчыцкага саставу ва універсітэце» з тым, каб сумесна з дэканатамі і партбюро факультэтаў распрацаваць перспектыўны план падрыхтоўкі і выхавання кадраў прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Асобная роля у ідэйным выхаванні студэнтаў належыць грамадскім навукам, якія ў вялікай меры садзейнічаюць фарміраванню светапогляду асобы. Здзяйсняючы пастанову ЦК КПСС «Аб мерах па развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве», кафедры грамадскіх навук імкнуцца палепшыць якасць выкладання. Ужо ўвайшлі ў традыцыю адкрытыя лекцыі і семінарскія заняткі, абмеркаванне тэкстаў лекцый, узаеманаведванне лекцый і семінарскіх заняткаў. Сталі больш прымяняцца наглядныя дапаможнікі і тэхнічныя сродкі навучання. Тлумачэнне тэарэтычных пытанняў цясней увязваецца з практычнымі задачамі камуністычнага будаўніцтва, з профілем будучай прафесіі студэнта. Паляпшэнне выкладання садзейнічала больш глыбокаму інтарэсу моладзі да грамадскіх навук. Аб гэтым сведчаць вынікі экзаменаў па грамадскіх дысцыплінах. Колькасць добрых і выдатных адзнак склала ад 77 да 93 працэнтаў. З іх: па навуковаму камунізму — 87 працэнтаў, па філасофіі—83,2, па палітэканоміі—83 працэнты і г. д. З году ў год расце лік студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх дысцыплінах. Толькі ў 1971—1972 навучальным годзе студэнтамі было падрыхтавана на агляд 1.563 работы па грамадскіх навуках. Прадстаўлена на рэспубліканскі агляд 138; з іх атрымалі І катэгорыю 32 работы. На Усесаюзны агляд прадстаўлена 32 работы, атрымалі І і ІІ катэгорыі 14 работ. Аднак калі паглядзець, як гаварыў тав. Машэраў на рэспубліканскім злёце студэнтаў, на гэтыя лічбы з другога боку, то мы ўбачым і свае недахопы. Далёка не па ўсіх грамадскіх дысцыплінах у студэнтаў абуджана жаданне займацца навукова-даследчай работай. У той час як на кафедрах гісторыі КПСС было падрыхтавана 1.060 студэнцкіх работ, на кафедры філасофіі толькі 92, гісторыі філасофіі і логікі — 58, на абедзвюх кафедрах палітэканоміі — 152, на кафедры навуковага камунізму толькі 59 работ.

Нам яшчэ не ўдалося да канца пераадолець недахопы ў выкладанні і вывучэнні грамадскіх навук. Часам выкладанне вядзецца няякасна, без непасрэднай сувязі з сучаснасцю, з практыкай камуністычнага будаўніцтва, без уліку профілю факультэта. Усё гэта адмоўна адбіваецца на ведах студэнтаў. У апошнюю сесію 112 студэнтаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі, 1.338 чалавек заслужылі толькі здавальняюча.

Гаворачы аб павышэнні ролі грамадскіх навук у ідэйным выхаванні студэнтаў, трэба сказаць аб неабходнасці больш сур'ёзна падыходзіць да падбору выкладчыкаў на гэтыя кафедры. Маральнае аблічча кожнага выкладчыка не павінна выклікаць сумнення, а выкладчыка грамадскіх дысцыплін—асабліва. Тут павінны працаваць людзі высокай свядомасці. На жаль, у нас да гэтага часу сустракаюцца адваротныя з'явы.

Было б няправільна абмежаваць выхаванне ідэйнай сталасці, камуністычнага светапогляду ў студэнта толькі навучальным працэсам. Вялікую ролю тут адыгрывае палітыка-выхаваўчая работа ў пазавучэбны час. Партком, рэктарат, дэканаты і партбюро стараюцца надаць ёй стройны і арганізаваны характар. Ва універсітэце ёсць пяцігадовы план палітыка-выхаваўчай работы. На аснове перспектыўных планаў складаюцца планы на кожны навучальны год, семестравыя.

Аналіз планаў палітыка-выхаваўчай работы паказаў, што большасць кафедр прадумана плануюць гэтую работу. Да ліку такіх адносяцца кафедра беларускай літаратуры (былы загадчык І. Я. Навуменка), кафедра рускай савецкай літаратуры (Л. І. Фіглоўская), кафедра агульнай фізікі (А. М. Саржэўскі), кафедра тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі (Б. В. Стральцоў), кафедра фізічнай геаграфіі зарубежных краін (В. Р. Заўрыеў), кафедра біяхіміі і біяфізікі (А. Ц. Пікулеў), кафедра крымінальнага права (І. С. Цішкевіч) і многія іншыя.

Тут сістэматычна абмяркоўваюцца пытанні ідэйна-выхаваўчай работы, справаздачы выкладчыкаў і куратараў па гэтых пытаннях. Сталі больш разнастайнымі формы і метады, павысіўся яе тэарэтычны ўзровень. Значна ўзбагаціўся змест ідэйна-выхаваўчай работы ў сувязі з падрыхтоўкай і святкаваннем 50-годдзя СССР.

Аднак, крытычна адносячыся да вынікаў сваёй работы, мы павінны галоўную ўвагу сканцэнтраваць на недахопах, якіх у нас яшчэ многа. Сутнасць іх у асноўным зводзіцца да наступнага: па-першае, нізкая эфектыўнасць многіх мерапрыемстваў (інакш чым можна растлумачыць той факт, што ў нас яшчэ не зжыты амаральныя ўчынкі з боку студэнтаў). Прычым колькасць гэтых учынкаў на асобных факультэтах не памяншаецца, а павялічваецца. Толькі сёлета выключана за п'янства і іншыя амаральныя ўчынкі 10 чалавек, з іх 8— студэнты юрфака і фізфака. Мы часта атрымліваем паведамленні з міліцыі аб ганебных паводзінах нашых студэнтаў у грамадскіх месцах. Частка студэнтаў нядбайна адносіцца да вучобы.

Па-другое, вельмі многа яшчэ фармалізму ў правядзенні ідэйна-выхаваўчай работы. Часта гэты фармалізм пачынаецца ўжо з фармальнага падыходу да планавання ідэйна-выхаваўчай работы, як, напрыклад, на кафедрах фізвыхавання, ядзернай фізікі, фізіялогіі чалавека і жывёл.

Па-трэцяе, часам у пагоні за колькасцю мерапрыемстваў мы зніжаем іх якасць, некаторыя мерапрыемствы праводзяцца без належнай падрыхтоўкі, арганізоўваюцца недастаткова прадумана, што не толькі зніжае іх эфектыўнасць, але і прыводзіць нават да зрываў. Вось свежы факт: 21 красавіка павінен быў адбыцца агульнаўніверсітэцкі вечар працоўнай славы, на які было запрошана каля тысячы чалавек. І толькі ў выніку таго, што камітэт камсамола універсітэта пусціў на самацёк падрыхтоўку да яго, вечар фактычна сарваўся.

Адным з недахопаў з'яўляецца тое, што ў арганізацыі ідэйна-выхаваўчай работы няма належнай каардынацыі. Часта кафедры і грамадскія арганізацыі дзейнічаюць уразнабой, а па некаторых пытаннях дублююць адна другую, некаторыя ж пытанні застаюцца нявырашанымі.

Па-чацвёртае, мы яшчэ не навучыліся даходзіць да кожнага студэнта. Часта больш працуем сярод актыву, найбольш свядомай часткі студэнтаў, а астатнія выпадаюць з поля зроку.

Ва ўмовах, калі наш калектыў ператварыўся ў шматтысячны, агульнымі мерапрыемствамі немагчыма ахапіць усіх студэнтаў. Цэнтр цяжару выхаваўчай работы павінен быць перанесен у акадэмічную групу, на курс. Трэба ўзняць адказнасць партыйных груп і камсамольскіх арганізацый за пастаноўку ідэйна-выхаваўчай работы, ролю куратара. Ва універсітэце ўжо спынілася дыскусія аб тым, патрэбны ці не патрэбны куратары. Патрэбны. Цяпер у нас працуюць 409 куратараў, з іх 110 камуністаў, тры дактары навук і 134 кандыдаты. Можна назваць многіх, хто свае веды, усю сілу сваёй душы аддае пачэснай справе — камуністычнаму выхаванню студэнтаў. Да іх адносяцца Ю. І. Драгун, Я. А. Навуменка, В. В. Казлова, Н. П. Сікорская, В. І. Ткачэнка, І. І. Жураўская, А. В. Малашэвіч, А. А. Плаўнік і многія іншыя. Палова кураторскага саставу працуе пяць і больш год, накапіла вялікі вопыт. Але гэты вопыт мала абагульняецца і распаўсюджваецца сярод маладых куратараў.

Сур'ёзныя недахопы ёсць у пастаноўцы выхаваўчай работы ў інтэрнатах. З 9 тысяч студэнтаў стацыянара больш 5 тысяч жыве ў інтэрнатах. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што работа ў інтэрнатах павінна была стаць адным з галоўных напрамкаў у дзейнасці парткома, партыйных арганізацый. Аднак гэтага пакуль няма. Пасля дэталёвай і працяглай праверкі ў красавіку на бюро гарадскога камітэта партыі была заслухана справаздача парткома аб стане выхаваўчай работы ў інтэрнатах. Бюро гаркома адзначыла сур'ёзныя недахопы. Асабліва вялікія прэтэнзіі прад'яўлены да санітарнага стану інтэрнатаў №№ 7, 6, 4. Камісіяй былі выяўлены факты п'янак, парушэння правіл унутранага распарадку. Так, 8 сакавіка ў інтэрнаце № 2 адбылася бойка па віне студэнта М. Міхайлава, які быў п'яным. 25 сакавіка ў інтэрнаце № 1 была выяўлена п'янка ў пакоі № 52. У мінулым годзе за розныя правіннасці выселены з інтэрнатаў 51 студэнт, у гэтым — 33.

Выхаваўчая работа ў інтэрнатах яшчэ не ператварылася ў сістэму. Планы работы ў інтэрнатах не заўсёды канкрэтныя, недастаткова прадуманыя — на хімічным факультэце, факультэце прыкладной матэматыкі. Яны не заўсёды даводзяцца да студэнтаў. Партбюро слаба кантралюе іх выкананне.

Бюро гаркома партыі патрабавала ліквідаваць існуючыя недахопы, зрабіць выхаваўчую работу ў інтэрнатах сістэматычнай і мэтанакіраванай, не адрываць яе ад ідэйна-выхаваўчай работы, якая праводзіцца на факультэтах.

Асаблівы папрок трэба зрабіць прафкому універсітэта. Работа ў інтэрнатах— гэта яго святы абавязак. І гэты абавязак прафком не выконвае. Прафкому універсітэта сумесна з партарганізацыямі трэба тэрмінова наладзіць работу студсаветаў, ленінскіх пакояў, абнавіць наглядную агітацыю.

Мы павінны ўзняць асабістую адказнасць студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах. Гэта дарослыя людзі, якім нянькі не патрэбны. Яны самі павінны ўмець арганізаваць свой быт і несці адказнасць за свае правіннасці.

Трэба павысіць ролю камуністаў, якія жывуць у інтэрнатах, а іх там 174 чалавекі. Цяпер у інтэрнатах створаны партгрупы. Мы спадзяемся, што яны будуць добрымі памочнікамі ў наладжванні парадку ў інтэрнатах.

Зараз у партыйных арганізацыях факультэтаў праходзяць партыйныя сходы з абмеркаваннем пытання аб выхаваўчай рабоце ў інтэрнатах, прымаюцца меры да паляпшэння гэтай работы.

* * *

Сакратар парткома Т. Я. Дударава многа ўвагі ўдзяліла правядзенню палітінфармацый, іх якасці, перыядычнасці, адзначыла, што ў некаторых групах факультэтаў журналістыкі, фізічнага, матэматычнага, юрыдычнага, геаграфічнага адсутнічае прыкладная іх тэматыка, у той час як яна зацверджана парткомам і разаслана па факультэтах.

Сур'ёзная размова вялася па праблемах грамадскай работы студэнтаў, развіцця мастацкай самадзейнасці. Адзначаны недахопы ў рабоце насценнага друку, недастатковае выкарыстанне ў ідэйным выхаванні студэнтаў шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт», нагляднай агітацыі.

* * *

У выступленнях камуністаў тт. Шуканава, Драбязкі, Мешчаракова, Шубы, Слукі, якія прынялі ўдзел у абмеркаванні даклада, прагучаў агульны клопат пра ўдасканаленне форм і спосабаў ідэйнага выхавання студэнцкага калектыву. Камуністы абмяняліся думкамі і вопытам, які дае станоўчыя вынікі ў паўсядзённай выхаваўчай практыцы, выказалі свае карысныя прапановы, рашуча асудзілі факты амаральных паводзін асобных прадстаўнікоў універсітэцкага калектыву.

— Пытанне ідэйна-палітычнага выхавання — найважнейшае,—гаворыць рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі.—Нам патрэбны спецыялісты з вялікім патэнцыялам ідэйнай перакананасці, якія могуць весці за сабой, быць арганізатарамі. У дакладзе сакратар парткома Т. Я. Дударава адзначыла некаторыя істотныя недахопы ў нашай працы. Асобна трэба сказаць аб маральным абліччы нашых выкладчыкаў. Большасць выкладчыкаў даюць узорны прыклад моладзі. Аднак, на жаль, ёсць і такія, што ганьбяць званне савецкага педагога і выкладчыка. Таму пытанне палітыка-выхаваўчай работы з выкладчыкамі не можа нас не трывожыць. Людзі, якія парушаюць маральныя прынцыпы, не маюць права працаваць у вышэйшай навучальнай установе.

Нельга мірыцца з фактамі недастойных паводзін студэнтаў. У гэтым годзе за амаральныя ўчынкі (п'янства, дэбашырства) адлічана з універсітэта 13 студэнтаў. На многіх накладзены суровыя адміністрацыйныя спагнанні, больш 30 студэнтаў выселены з інтэрнатаў. Значыць, у нас яшчэ не ўсё добра. І мы павінны ўсё зрабіць для таго, каб выхоўваць маральна ўстойлівых, палітычна адукаваных будаўнікоў камунізму.

* * *

Сход прыняў пастанову, у якой вызначаны шляхі дзейнасці партыйнай арганізацыі БДУ па павышэнню ўзроўню палітыка-выхаваўчай работы.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

# ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ НА КАНТРОЛІ

**У нашай газеце 1 лютага 1973 года былі апублікаваны матэрыял аб выніках праверкі універсітэцкіх сталовых і буфетаў групай народнага кантролю БДУ і рэкамендацыі па ліквідаванню выяўленых недахопаў. Нядаўна сектар быту ГНК праверыў, як выконваецца пастанова бюро, што зроблена для паляпшэння работы прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Адзначана, што ў сталовай і буфеце хімічнага корпуса палепшыўся санітарны стан памяшканняў, адкрыта зала комплексных абедаў. Адрамантавана кухоннае абсталяванне і халадзільная шафа. Значна лепшай стала якасць страў і культура абслугоўвання.**

**У буфеце галоўнага корпуса адрамантавана электрапліта, устаноўлены жарачная шафа, у гароднінным складзе — мыечныя ракавіны.**

**Адкрыт буфет у інтэрнаце № 7. Абслугоўванне тут не выклікае нараканняў. Стравы добрай якасці, гарачыя. Працуе буфет у дакладна вызначаныя гадзіны.**

**Лепшы, чым папярэдні, новы расклад работы буфета ў інтэрнаце № 1. Чыста і ўтульна ў буфеце корпуса радыёфізікі. Тут дастатковы асартымент прадуктаў, правільнае іх захоўванне.**

**Аднак па-ранейшаму не працуе вентыляцыя ў варачным цэху сталовай хімфака, не ўстаноўлены дадатковыя марміты для падагрэву першых страў.**

**Па сутнасці не змяніліся тэрміны дастаўкі прадуктаў у буфет галоўнага корпуса. У сталовай № 33 не вырашана праблема кадраў — не хапае павароў і мыйшчыц посуду, не палепшаны ўмовы ў мыечным цэху. Колькасць і асартымент прадуктаў не задавальняе патрэб.**

**ГНК універсітэта рэкамендавала загадчыцы сталовай № 33 т. Трайновай прыняць неадкладныя захады.**

**Адміністрацыйна - гаспадарчай частцы — у бліжэйшы тэрмін ліквідаваць непаладкі ў пасудамыечным цэху сталовай № 33 і ў сталовай хімкорпуса, завяршыць к новаму 1973—1974 году работы па расшырэнню буфета ў корпусе філалагічнага факультэта і на працягу 1973—1974 года абсталяваць у цокальным паверсе галоўнага корпуса сталовую на 120 месц. Выказана шэраг іншых прапаноў і рэкамендацый.**

**Л. БЫЛІНА,**
**кіраўнік сектара быту ГНК БДУ.**

## КАВАЛЕРЫ ОРДЭНА СЛАВЫ

КОЖНЫ пражыты намі мірны год аддзяляе ў часе пераможны май 1945-га, але не згасае подзвіг нашага народа, не сціраюцца ў памяці ні страшная навала вайны, ні ўрачыстасць перамог, здабытых цаной мужнасці і стойкасці, воінскага майстэрства, беззапаветнай любві да Айчыны яго сыноў і дочак. У дзень усенароднага свята ветэраны Вялікай Айчыннай вайны ўспамінаюць былыя баі і даюць маладым самыя запамінальныя ўрокі таварыства, вернасці доўгу, урокі патрыятызму.

Сёння слова кавалерам і аб кавалерах салдацкага ордэна Славы. Ва універсітэцкім калектыве іх восем. Праўда, пагаварыць нам давялося не з усімі: у гэтыя



# САЛДАЦКАЯ ДОБЛЕСЦЬ

перадсвяточныя дні ў ветэранаў прыбавілася грамадскіх даручэнняў. Яны выступаюць у студэнцкіх аўдыторыях і ў школах, сустракаюцца з рабочымі і маладымі воінамі.

Хвалюючыя гутаркі з кавалерамі ордэна Славы адбыліся на ваеннай кафедры БДУ і ў рэдакцыі шматтыражкі. І хоць прайшло амаль трыццаць год паміж днём сённяшнім і тымі, ъ нымі, ва ўспамінах удзельнікаў вялікай бітвы з фашызмам жывыя да дэталей і дробязей баявыя эпізоды, назвы населеных пунктаў на франтавых дарогах і нават прыкметы часу, надвор'я. Таму слухаеш і так жыва ўяўляеш і месца бою, і напружанне атакі, сэрцам адчуваеш боль страты сябра. І бачыш ужо перад сабой не салідных выкладчыкаў універсітэта, а працаўнікоў вайны ў разведцы і ў баі, у час стамляльных маршаў, у халодных акопах...

* * *

...Асенняя непагадзь распусціла тлустыя кубанскія чарназёмы. Вораг набліжаецца да станіцы Стара-Леушкоўскай, і шаснаццацігадовы Вячаслаў Шкарупа разам з бацькам выганяе ў горы племянных коней мясцовага конзавода. А калі закончылася фарміраванне казачага кавалерыйскага корпуса, юнак становіцца яго байцом. Сячэ ворагаў у цяжкіх баях на Каўказе. А пасля са сваім зенітным кулямётам ідзе дарогамі Украіны, Беларусі, Венгрыі, Чэхаславакіі. Тройчы паранен, двойчы кантужан. Атрымаў толькі за 1944 год дванаццаць падзяк Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за ўдзел у бліскучых перамогах над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

— Воінскую навуку праходзіў у цудоўнага чалавека,— расказвае Вячаслаў Нічыпаравіч.—Мой першы нумар у зенітным разліку Васіль Ціханавіч Дроннікаў быў чалавекам, які не ведаў страху. Не было выпадку, каб у яго нешта не ладзілася са зброяй, нешта выйшла са строю. Заўсёды сабраны, заўсёды гатовы да бою, і вёў яго ўмела, знішчаючы ворага. Ён не проста ваяваў побач, а вучыў, як правільна размясціць і падрыхтаваць зброю, выбраць цэль.

Ваяваць было цяжка. Ні адзін фільм не можа паказаць тое, што перажыта. Асабліва запомнілася 30 сакавіка 1945 года. Вораг жорстка абараняўся. На працягу сутак 18 фашысцкіх контратак адбіў наш эскадрон...

— А я прыняў першы бой на тэрыторыі Літвы, затым ваяваў у саставе танкавага знішчальнага дывізіёна ва Усходняй Прусіі,— пачынае расказ выкладчык геафака Уладзімір Уладзіміравіч Стэцко. — Вельмі добра памятаю, як рыхтаваліся да ўзяцця Кенігсберга. Подступы і сам горад уяўлялі магутную сістэму ўмацаванняў з супрацьтанкавымі рвамі, міннымі палямі і загараджэннямі. Вельмі дапамаглі нам «кацюшы». І цяпер памятаю характэрны гук палёту снарадаў і знішчальную сілу іх агню...

У гэтым пункце скрыжаваліся дарогі вайны і яшчэ трох кавалераў ордэна Славы — Пятра Рыгоравіча Бароўскага, Антона Антонавіча Лабуды і Георгія Георгіевіча Герасіменкі.

— Пасля 80-кіламетровага пераходу селі сярод купін у балотах. Са світаннем пачалі акопвацца, — успамінае П. Р. Бароўскі. — Раніцай гітлераўцы павялі артпадрыхтоўку. Б'е цяжкая артылерыя, мінамёты. З'явіліся параненыя, адпраўляем іх у медсанбат. А калі загаварылі нашы гарматы, стала весялей. Хутка пайшла авіяцыя, якая прыбавіла нам радасці. І ўжо ў наступленне пайшлі імкліва. Занялі населены пункт, захапілі многа палонных, пасля праз лес — да горада. Выбівалі ворага са склепаў і падвалаў...

А перамогу сустрэў на Балтыцы. Часць стаяла на адпачынку, я быў у каравуле. І спачатку не зразумеў, што азначаюць бязладныя выстралы і ракеты, а пасля, нібы эха: «Вайна закончылася!» Паўскоквалі з нар салдаты, хто скача, хто плача...

Пад Кенігсбергам атрымаў баявое хрышчэнне і ордэн Славы васемнаццацігадовы кулямётчык Георгій Герасіменка. Яго расказ крайне сціслы. Закончыў восем класаў. Нядоўгая ваенная вучоба — і фронт, з кастрычніка 1944 года. У саставе ўдарнага батальёна 11-й Гвардзейскай арміі ўдзельнічаў у прарыве на перадавой Трэцяга Беларускага фронту. Адбіваючы танкавую атаку, быў паранен. Гэта — пратакольны запіс, а за ім — салдацкія будні, калі сон цаніўся як узнагарода і салодкімі былі нават некалькі хвілін, якія ўхітраўся сэканоміць, хутчэй за ўсіх выкапаўшы акоп... Бой, калі, прыладзіўшы свой кулямёт ля агарожы нейкага маёнтка, сачыў за правым флангам сваіх і за «Фердынандам»... Варожая атака — і пачуццё ўдзячнасці безадказнаму працаўніку-кулямёту, які слаўна паслужыў гаспадару...

Я асцярожна перакладваю на стале пажоўклыя, пацёртыя на згібах дакументы вайны — падзякі, паведамленні аб прадстаўленні да ўзнагарод, чытаю сардэчныя і, здавалася б, незвычайныя ў той суровы час словы камандавання: «Паважаны таварыш Лабуда Антон Антонавіч! У рашаючых баях пры ліквідаванні групіроўкі нямецкіх войск на Зямландскім паўвостраве Вы праявілі мужнасць, храбрасць і адвагу.

За самаадданае выкананне баявога задання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі аб'яўляю Вам падзяку і прадстаўляю да ўрадавай узнагароды.

Жадаю новых баявых поспехаў у імя нашай Радзімы.

Моцна цісну Вашу мужную руку.

Камандзір Ярошын».

Для Антона Антонавіча Лабуды вайна не закончылася 9 мая. Вопыт палкавога разведчыка спатрэбіўся ў час ваенных дзеянняў супраць мілітарысцкай Японіі. У цяжкіх умовах пустынных і гарыстых раёнаў савецкія салдаты доблесна вялі да завяршэння другую сусветную вайну.

— Першая разведка амаль не закончылася для нас трагічна. Двое сутак без вады, спякота невыносная. Выручылі таварышы. А пасля падышлі нашы часці, падцягнуліся абозы.

Не забыць, як на голай сопцы двое сутак трымалі абарону. Затым удзельнічалі ў раззбраенні Квантунскай арміі... І толькі ў 1947 годзе вярнуўся дадому.

Сёння салдаты вайны — на мірных рубяжах. Але іх подзвіг, мужнасць, вопыт і веды служаць цудоўнай справе выхавання новых савецкіх патрыётаў.

**А. АЛЕНІЧ.**

*НА ЗДЫМКУ: кавалеры ордэна Славы ў час сустрэчы на ваеннай кафедры.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# ГАРТАЮЧЫ КНІГУ ЖЫЦЦЯ

Незвычайна рана пачалася вясна ў гэтым годзе. Ужо ў сярэдзіне красавіка слабенькая зялёная траўка прабілася скрозь зляжалую за зіму зямлю і густым дываном услала гадавальнік па Ракаўскай шашы. Надта цёпла ў такія дні, так і хочацца прысесці дзе-небудзь і, углядаючыся ў шэра-блакітнае неба, слухаць размову ранніх птушак.

Так мы і зрабілі са Сцяпанам Мітрафанавічам Грабчыкавым — уселіся на абрыве ў канцы гадавальніка на мінулагоднюю пасохлую мучку і глядзелі ўніз, дзе гулялі дзеці. Тыя ж хутка прынеслі мішэнь і пачалі страляць. Як і патрэбна, па чарзе, яны падыходзілі да адзначанага месца і, калі старэйшы адыходзіў, гучаў стрэл. Сцяпан Мітрафанавіч пільна назіраў за дзецьмі і пасля кожнага новага стрэлу твар яго ўздрыгваў, станавіўся нейкім задуменным. Мне здавалася спачатку, што гэта ад блізкасці стрэльбішча, але не, чалавеку ўспомніліся светлыя юнацкія гады на Віцебшчыне ў пасёлку Леніна. Тады хацелася хутчэй стаць дарослым. І вось выпускны вечар у школе: музыка, віншаванні, пажаданні, дамова аб сустрэчы...

— Сустрэцца праз год і праз два не давялося. Музыка школьнага вальса змянілася грукатам вайны. Мы з сябрам Іванам Яўменавым былі залічаны ў школу радыстаў. Рыхтавалася рашучае наступленне нашых войск, — успамінае Сцяпан Мітрафанавіч.

...Набліжаўся 1943 год— пераломны ў вайне. Сяржант Грабчыкаў разам з сябрамі рыхтаваўся да наступлення на Варонеж. І вось загад: разам з дэсантам аўтаматчыкаў, на двух танках рухацца ў разведку, кіруючыся на вёску Пераступіна. У прыцемках танкі прайшлі некалькі кіламетраў. Цішыня... Навокал — ніводнага чалавека, пры адыходзе фашысты знішчылі ўсё жывое. Пярэдні танк нечакана спыніўся — аднекуль з'явіліся немцы, і пачалася страляніна. Камандзір станцыі Лёва Белазёрскіх і Фёдар Арцюхоў—лепшыя сябры—пайшлі ў разведку, астатнія занялі абарону. Вораг, не губляючы часу, перайшоў у атаку.

«Перадаць сваім аб засадзе, папрасіць падмацаванне», — мільганула думка.

Звыклым рухам Грабчыкаў хапае навушнікі з мікрафонам, уключае тумблер, але чамусьці не чутна характэрнага шуму і піску. І толькі цяпер сержант заўважыў, што радыёстанцыя стала падобнай на сіта — выпраўляць нечага. У засадзе прыйшлося змагацца з мацнейшым у некалькі разоў ворагам. Засталіся лічаныя таварышы, камандаванне прыйшлося ўзяць на сябе.

Падмога ўсё ж прыйшла. Вораг быў выбіт з Перастуціна, нашы войскі выйшлі на лінію Сеўск—Рыльск. Гэта быў першы сур'ёзны бой Сцяпана Грабчыкава. Потым іх было шмат, але першы — ён заўсёды перад табой, як сёння...

Але галоўны бой быў наперадзе, у арэнбургскім шпіталі, куды трапіў Сцяпан Мітрафанавіч з траўмай чэрапа. Пяць гадзін прафесар Сястрыцкі вёў цяжкую аперацыю і зрабіў яе найлепшым чынам.

— Праз некалькі месяцаў сустракаў Дзень Перамогі пад Мінскам. Не верылася, хацелася адпомсціць ворагу за аднапалчан, але ў ваенкамаце не пускалі на Усходні фронт. Прыходзілася каля дзесятка разоў праходзіць камісіі, пакуль быў атрыман дазвол і тым самым права на самасцвярджэнне...

Вярнуўся Сцяпан Мітрафанавіч з чарговым медалем «За перамогу над Японіяй». Адразу ж паступіў на вучобу ва універсітэт. Цяжка было назваць Мінск таго часу горадам: усё ў развалінах. Прыйшлося жыць, вучыцца, працаваць у адным і тым жа корпусе цяперашняга журфака. І хто мог падумаць, што праз дваццаць гадоў прыйдзецца зноў хадзіць па знаёмых аўдыторыях, аднооўленых некалі сваімі рукамі, чытаць лекцыі такім жа, як некалі сам, студэнтам...

Часта многія здзіўляюцца, бачачы, як гэты высокі, з пасівелай галавой чалавек прагульваецца па гадавальніку па Ракаўскай шашы. А здзіўляцца няма чаму. Ён сярод вечнага — прыроды— сустракае сваю немаладую вясну.

**А. САЧАНКА.**

# СУСТРЭЧА З ГЕРОЕМ

На геафаку адбылася канферэнцыя чытачоў па кнізе І. Ф. Клімава «Партызаны Вілейшчыны», прысвечаная Дню Перамогі.

У госці да студэнтаў прыйшоў Павел Якаўлевіч Сырамаха — былы камандзір партызанскай брыгады імя Жукава. З цікавасцю слухалі студэнты яго выступленне. З дакладамі аб партызанскім руху на Вілейшчыне выступілі студэнты Н. Петрачэнкава, М. Рускевіч, О. Дурко, А. Пірожнік. У 58-й аўдыторыі была арганізавана кніжная выстаўка «Партызанскай сцежкай». Да канферэнцыі студэнты падрыхтавалі фотастэнд «Партызаны Вілейшчыны» і склалі схему размяшчэння партызанскіх брыгад на Вілейшчыне.

Гэтую цікавую сустрэчу падрыхтавалі разам з супрацоўнікамі бібліятэкі член партбюро геафака Б. А. Монак і выкладчыца кафедры рускай савецкай літаратуры Н. М. Рамашка.

**А. РУКШЫН,**
загадчык аддзела абслугоўвання бібліятэкі.

*Колькі іх, сціплых помнікаў і абеліскаў, магіл вядомых і невядомых салдат Вялікай Айчыннай рассыпана па зямлі нашай Радзімы!*

*Подзвігі гераічных абаронцаў Бацькаўшчыны ўвекавечаны ў бронзе і граніце.*

*Ля Крамлёўскай сцяны ўдзень і ўначы палае Вечны агонь Славы.*

*Ніхто не забыты, нішто не забыта.*





# 5 мая савецкія журналісты адзначылі Дзень друку

**На здымку:** студэнты-практыканты факультэта журналістыкі на чарговай «лятучцы» ў рэдакцыі піянерскай газеты «Зорька».

Фота **Д. Чаховіча.**



## У ЭФІРЫ— УНІВЕРСІТЭТ

Першае мая гэтага года стаў днём нараджэння універсітэцкай радыёгазеты. У 10 гадзін раніцы студэнты і выкладчыкі БДУ праслухалі «сваю» першую перадачу, прысвечаную святу.

Па радыё выступілі рэктар універсітэта прафесар У. М. Сікорскі, дацэнт факультэта журналістыкі М. Е. Дастанка, доктар гістарычных навук Д. П. Жмуроўскі, студэнтка філалагічнага факультэта Т. Жук, сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Слука і замежныя студэнты Марыян Іванаў (Балгарыя), Іяханэс Шук (ГДР), Нгуен Шы Тхін (ДРВ).

Першы выпуск радыёгазеты «Беларускі універсітэт» падрыхтавалі студэнты групы радыё і тэлебачання факультэта журналістыкі Сяргей Цівінаў, Уладзімір Субат, Таццяна Тарлецкая, Аляксандр Міхальчанка, Уладзімір Купрыенка. Вялі перадачу Алена Сінькевіч і Вячаслаў Ракіцкі.

## ДЗЕНЬ ГАЗЕТНАЙ ПАЛАСОЙ

Колькі часу трэба патраціць, каб абысці універсітэцкія калідоры? На гэтае пытанне было б, напэўна, адказаць няцяжка, калі б мы былі перакананы, што можна раўнадушна прайсці ля шматлікіх насценных газет, якія вывешваюцца на факультэтах. Кожная з іх, па-свойму адметная і цікавая, вабіць і запрашае да сябе. А спынішся — пазнаёмішся не з газетай, а са студэнцкім жыццём, нібы прыкладзеш руку да яго пульса.

Першамайскія насценныя газеты асабліва цікавыя. І не толькі сваім афармленнем. У іх — вясна, вясёлая, цікавая студэнцкая вясна. Са святочным настроем, з напружаным рытмам работы, з подыхам блізкай сесіі. Ленінскі камуністычны суботнік, Першамай, свята Перамогі — гэтыя важнейшыя падзеі наклалі свой яркі адбітак на ўсе факультэцкія газеты. Прайшлі ва універсітэце дні хіміка, матэматыка — аб іх таксама расказваецца ў газетах. Вучоба, адпачынак, справы камсамольскія, прафсаюзнае жыццё, трэці працоўны семестр — аб усім гэтым вы даведаецеся, пазнаёміўшыся з «Савецкім юрыстам», «Хімікам», «Гісторыкам», «Журналістам».

Гэта толькі «вялікія» газеты. А колькі ў іх меншых сясцёр — газет курсавых, СНТ, СБА, «Камсамольскіх пражэктараў»! На адным толькі факультэце прыкладной матэматыкі вывешана чатыры газеты студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Тут і «Зубронак», і «Шпалы», і «Нястомныя», і «Архітэктар».

І сёння з выпадку толькі што прайшоўшага Дня друку мы віншуем нястомных працаўнікоў - газетчыкаў са святам, жадаем выдатных поспехаў у вучобе, працы, новых творчых знаходак.

З вялікім задавальненнем мы выказваем словы падзякі і нашым памочнікам— карэспандэнтам «Беларускага універсітэта» дацэнту В. П. Рагойшы, навуковаму супрацоўніку С. М. Жаўрыд, няўрымслівым першакурснікам журфака і многім іншым сябрам газеты.

## У РОДНЫХ СЦЕНАХ

На журфаку ў Дзень друку па традыцыі сабраліся выпускнікі розных год. Журналісцкае свята заўсёды кліча байцоў пяра пабываць у родных сценах, пагля-дзець на маладое журналісцкае пакаленне.



РАБОТНІКІ ПРЭСЫ НА СВАІМ ПАСТУ. Фота М. Нечыпарэнкі.

## ВЫЗНАЧАНЫ ЛЕПШЫЯ

У Дзень друку кожны год збіраюцца на ўрачысты сход супрацоўнікі універсітэцкага выдавецтва. Вось і на гэты раз адзначыць сваё свята прыйшлі рэдактары, карэктары, работнікі ўсіх служб выдавецтва. Сакратар партарганізацыі П. М. Бараноўскі павіншаваў прысутных з журналісцкім святам, коратка расказаў аб развіцці выдавецкай справы ў нашай краіне.

Дырэктар выдавецтва Л. А. Севасцьянчык таксама павіншавала ўсіх тых, хто ўдзельнічае ў стварэнні кнігі, расказала аб выніках спаборніцтва мінулага года.

Да свайго свята супрацоўнікі выдавецтва прыйшлі з добрымі паказчыкамі. Паспяхова выканан план першага квартала гэтага года. Кнігі з маркай БДУ імя У. І. Леніна прыхільна сустракаюць чытачы не толькі ў нашай рэспубліцы. Заказы на іх паступаюць і з зарубежных краін. Кожны год рэдакцыі і службы змагаюцца за права называцца лепшымі. На сходзе былі названы лепшыя кнігі 1972 года. Гэта «Тэорыя маральнага выхавання» У. Ф. Харламава (рэдактар Л. Самасейка), «XXIV з'езд КПСС. Матэрыялы да лекцый па гісторыі КПСС» калектыву аўтараў пад рэдакцыяй У. М. Сікорскага (рэдактары У. Пармон і Н. Бязрукава) і «Інтрадуцыраваныя дрэвы і кустарнікі заходняй часткі Беларусі» А. Т. Федарука (рэдактар Н. Батурыцкая). Рэдактарам і карэктарам названых кніг уручаны грашовыя прэміі. Акрамя таго, адзначаны мастацкі рэдактар Л. Мядзведзева, тэхнічны рэдактар В. Безбародава, якія ўдзельнічалі ў стварэнні кнігі А. Т. Федарука, удастоенай дыплома на рэспубліканскім конкурсе 1972 года на лепшую кнігу па мастацка-тэхнічнаму афармленню і паліграфічнаму выкананню.

Лепшай прызнана рэдакцыя прыродазнаўча-тэхнічнай літаратуры (загадчык Т. М. Белая).

**Н. КЛІШЭВІЧ.**

## ДЗЕЛЯ НЕКАЛЬКІХ РАДКОЎ

Перш чым чытаць гэты артыкул, уважліва прагледзьце ўсю газету. Прагледзелі? Не разумееце? Вядома. Што ў ёй такога: газета як газета — загалоўкі, фатаграфіі, малюнкі, заметкі. Столькі ні адна рэдкалегія плюс усе спачуваючыя студэнты не напішуць. Таму мы бярэм матэрыялы ў выкладчыкаў. Тактыка іх збору простая з віду:

а) адшукаць заметку даючага;

б) угаварыць заметку даючага заметку даць;

в) напомніць яму аб заметцы;

г) узяць у яго заметку.

Пасля чарговага пасяджэння рэдкалегіі «Віты» спецкоры рассыпаюцца па ўсяму корпусу, на асабістым вопыце пераконваючыся, што «трое суток не спать, трое суток шагать ради нескольких строчек в газете» — вечная наша доля.

Нястомны газетчык узносіцца на 8-ы паверх і на злом галавы збягае на першы. Ён урываецца ў аўдыторыі, зандзіруе глебу на кафедрах і засоўвае цікаўны нос у дэканат. Праходзіць дзень, другі. Нарэшце, аднойчы ў калідорнай далечыні замаячыць жаданы выкладчык, які паспеў стаць паўлегендай.

— Добры дзень. Я з рэдкалегіі, — нібы з-пад зямлі, вырастае субяседнік.

Выкладчык паварочваецца да яго, і... плакала твая лекцыя! Як назло, міма праходзіць лектар...

— Прабачце, я з рэдкалегіі насценгазеты «Віта». Не маглі б вы...

— Зноў з «Віты»? Я ж пісаў вам у мінулым годзе.

— Гэта было не нам, а ў СНТ. У вас тады атрымаўся добры артыкул, і мы спадзяемся, што вы не адмовіцеся напісаць у «Віту».

— Паслухайце, гэта было б неэтычна з майго боку. У мінулым годзе мяне друкавалі, у гэтым друкуюць. Неяк няёмка.

— Што ж тут дрэннага? Вы дапамагаеце нам.

— Дапамагчы я не адмаўляюся... Але згадзіцеся, гэты артыкул ніхто не будзе чытаць! На гэтую тэму трэба даць падборку артыкулаў з розных кафедр. Тады будзе куды цікавей!

Ад такой атакі газетчык губляе арыентацыю і пачынае гаварыць выклічнікамі:

— М-м-м...

— Вось бачыце! Акрамя таго, вы, здаецца, ужо пісалі аб гэтым.

— ???

— Не пісалі. Так-так, — і з новай энергіяй: — Зайдзіце вы на кафедру (называе кафедру) і звярніцеся да... (доўгі пералік імён).

Выкладчык пайшоў, падарыўшы на развітанне бацькоўскую ўсмешку. Артыкула няма. Выпуск затрымліваецца... Але няма такога становішча, з якога не было б выйсця. Сведчанне таму — мая заметка.

**Т. ЗЛОТНІК,**
**студэнтка IV курса.**
**(«Віта»).**

## ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ

У рыжскіх студэнтаў ёсць цудоўная традыцыя праводзіць у вну дні фізікаў, хімікаў, эканамістаў, географаў, філолагаў і г. д. Не з'яўляецца выключэннем і фізмат Латвійскага універсітэта імя П. Стучкі. Напярэдадні Першамая тут святкавалі «Дзень фізмата». Па традыцыі былі разасланы запрашэнні амаль ва ўсе універсітэты краіны. Адной з самых шматлікіх аказалася наша дэлегацыя: вакальна-інструментальны ансамбль «Вярба», студэнты I, III і IV курсаў фізфака — усяго 20 чалавек.

Рыга! Цудоўны горад з вузенькімі вулічкамі, гатычнымі помнікамі культуры, своеасаблівымі плошчамі, горад, які стаіць на дзівосна прыгожай рацэ Даугаве. Сапраўды, мае рацыю той, хто назваў Рыгу «маленькім Парыжам». Цудоўнае спалучэнне старыны і ўльтрасучасных будынкаў. Захапляюць шпілі Домскага сабора і помнік Свабоды, што цягнецца ў неба. Мы ўсе з вялікім задавальненнем крочылі па старой Рызе з нашымі гідамі— студэнтамі Латвійскага універсітэта, якія расказвалі аб Рызе ўчарашняй і сённяшняй.

І вось адкрыццё свята. Акрамя нас, на фестывалі прысутнічалі матэматыкі з Ерэвана, фізікі з МГУ, Харкава...

Першым у праграме свята быў «Вечар смеху». Яго адкрылі нашы студэнты з ансамбля «Вярба», якія выканалі некалькі беларускіх народных песень. Затым вядучыя запрасілі на сцэну ўсіх жадаючых прыняць удзел у КВЗ паміж фізікамі і матэматыкамі. З гасцей за матэматыкаў выступалі студэнты Ерэвана і Харкава, за фізікаў—масквічы і нашы рабяты. Скажам прама, яны нас не падвялі: перамаглі фізікі.

Пасля КВЗ адбыўся невялікі імправізаваны канцэрт-віншаванне. Кожная дэлегацыя прывезла з сабой па некалькі нумароў мастацкай самадзейнасці, якія і былі прадстаўлены на суд гледачоў. Нам вельмі спадабалася выступленне агітбрыгады студэнтаў МГУ. Нашы студэнты адкрылі вечар смеху, і так здарылася, што нам прыйшлося і закрываць яго. У памяць аб наведанні Латвійскага універсітэта мы паднеслі студэнтам фізмата беларускі сувенір. Затым дуэт гітарыстаў — студэнты I курса А. Мельнікаў і Е. Бараўко выканалі некалькі песень.

У канцы сустрэчы ўсе дэлегаты сабраліся на пасяджэнне клуба «Міф» (матэматыкі і фізікі), каб за шклянкай кавы абмяркаваць праблемы, якія хвалююць моладзь, паслухаць музыку, патанцаваць.

Але надышоў час развітання. Кожнаму з нас запомніліся Рыжскае ўзмор'е, музеі, канцэрт арганнай музыкі ў Домскім саборы, сустрэчы з латышскімі студэнтамі.

Мы лічым, што вельмі добра мець такія традыцыі. І хочацца верыць, што ў наступным навучальным годзе мы будзем прымаць латышскіх студэнтаў на нашым першым свяце — «Дні факультэта».

**В. СЯМЯКІНА,**
**Н. ШЫНКАРОВА,**
студэнткі IV курса фізфака.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
АТ 05216
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ 500.